## АСВЯШЧЭННЕ ПРЫРОДЫ

У Каталіцкім Касцёле існуе мноства чыноў асвячэння або благаслаўлення: вады або зямлі, гародніны, жывёл, нават кватэры або аўтамабіля

Асвячэнне прыроды – гэта не чараўніцтва, калі якое-небудзь рэчыва або прадмет становяцца «чарадзейнымі»

Калі асвячаецца якая-небудзь рэч, мы імкнёмся змяніць сваё стаўленне да яе, каб яна стала сродкам для дабрыні

Асвяціць стварэнне – азначае самому прыйсці да Бога

У Сакрамэнтах Касцёла ўжо тут і зараз плады зямлі і мы разам з імі мяняемся, асвячаемся, становімся прадвеснікамі Божага Валадарства на зямлі

Праз Уцелаўленне Хрыста ўвесь матэрыяльны свет стаў дастойны выратавання і паяднання з Богам.



## ЭКАЛАГІЧНА ДРУЖАЛЮБНАЯ ПАРАФІЯ ГЭТА:

калі штогод у ёй адзначаецца Дзень малітвы аб Божым стварэнні: праводзяцца экалагічныя мерапрыемствы, тэматычныя адукацыйныя семінары, экскурсіі

калі ў вучэбнай праграме нядзельнай школы ёсць заняткі, прысвечаныя хрысціянскаму стаўленню да навакольнага асяроддзя

калі парафіяне на Дзень Усіх Святых не набываюць пластыкавыя кветкі

калі парафіяне не ўпрыгожваюць пластыкавымі кветкамі галінкі вярбы, а для яек на Вялікдзень не выкарыстоўваюць пластыкавыя абгорткі

калі супольнасць добраўпарадкуе крыніцы, арганізоўвае экалагічныя міні-сцежкі, устанаўлівае велапаркоўку

калі парафіяне прымаюць удзел у экалагічных фестывалях, канферэнцыях і сустрэчах.



## БЫЦЬ СОЛЛЮ СВЕТУ

Кожны з нас – прыхаджанін альбо святар – можа паўдзельнічаць ў захаванні гэтага свету. Пачніце з сябе!

Прайдзіце бясплатнае навучанне ў экалагічнай анлайн-школе study.ecoidea.by

Для пакупак у краме паўторна выкарыстоўвайце поліэтыленавыя пакеты або насіце з сабой сумку з матэрыі

Замест аднаразовых выкарыстоўвайце е акумулятарныя батарэйкі. Адзін акумулятар здольны замяніць 600-800 батарэек

Вазьміце ўдзел ці станьце арганізатарам уборкі ў лесе, зялёных зонах побач з садаводчымі таварыствамі ці там, дзе адшукаеце смецце. Падрабязней на **www.letsdoit.by**

Не заставайцеся абыякавымі да навакольнага асяроддзя ў вашым населеным пункце.



## БОЛЬШ ДАВЕДАЦЦА ПРА УЗАЕМААДНОСІНЫ КАТАЛІЦКАГА КАСЦЁЛА І СТВАРЭННЯ:

«Laudato si» – пра клопат аб супольным доме. Кароткі змест энцыклікі

Ахова навакольнага асяроддзя (Кампендый сацыяльнага вучэння Касцёла, раздзел X, біблійныя аспекты)

Пасланне да святкавання Сусветнага Дня міру (1 студзеня 1990). Папа Ян Павел II

Энцыкліка Папы Бэнэдыкта XVI «Caritas In Veritate» («Любоў у ісціне»), (глава 2,4). 2009 г.

Энцыкліка Папы Яна Паўла II «Centesimus Annus» (Соты год), (главы 37, 38, 43). 1991 г.

Ксёндз Юрый Санько.
Тэалагічнае абгрунтаванне ўдзелу Касцёла ў вырашэнні экалагічных праблем – захаванне Божага стварэння.

Усе матэрыялы даступныя на сайце:

tvorenie.by

## ЧАЛАВЕК І СТВАРЭННЕ
tvorenie.by

«**Чалавек і стварэнне**» – перасоўная выстаўка аб захаванні стварэння Божага. Выстаўка складаецца з **11 інфармацыйных стэндаў**, якія апісваюць ролю чалавека і Касцёла ў вырашэнні экалагічных праблем сучаснасці. Праект быў створаны па благаслаўленні Арцыбіскупа Тадэуша Кандрусевіча, Мітрапаліта Мінска-Магілёўскага і ажыццёўлены напрамкам "Царква і ахова навакольнага асяроддзя" некамерцыйнай установы "Цэнтр экалагічных рашэнняў".

Па пытаннях, звязаных з выстаўкай, звяртайцеся ў Цэнтр экалагічных рашэнняў:

г. Мінск, пр. Машэрава, 9,
аўдыторыя 317

+375-17-334-53-23
+375-29-252-71-45

ecotvorenie@gmail.com

Старонка выстаўкі ў інтэрнэце:
http://ecoidea.by/ru/vystavka-tvorenie

ЧЕЛОВЕК И ТВОРЕНИЕ tvorenie.by
ЦЕНТР ЭКОЛОГИЧЕСКИХ РЕШЕНИЙ www.ecoidea.by
Kingdom of the Netherlands
Канферэнцыя каталіцкіх біскупаў Беларусі

Пры падтрымцы Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Рэспублікі Беларусь.

# Чалавек і стварэнне

Касцёльна-экалагічная выстаўка

ЧЕЛОВЕК И ТВОРЕНИЕ
tvorenie.by